

# Урок 118

Растлумач, як выканалі дзяленне на двухзначны лік.

1. Вызначаю **першае няпоўнае дзялімае**. Вызначаю колькасць лічбаў у дзелі. Знаходжу першую лічбу дзелі.
2. Вызначаю **другое няпоўнае дзялімае** — 5 дзясяткаў. Знаходжу другую лічбу дзелі — 0.
3. Вызначаю **трэцяе няпоўнае дзялімае**. Знаходжу трэцюю лічбу дзелі.
4. Чытаю адказ — … .






**1.** Вылічы.

1836 : 18 5684 : 28 5194 : 49 20 746 : 23

**2.** Разгледзь узор скарочанага запісу дзялення. Вылічы, выкарыстоўваючы скарочаны запіс.




9664 : 32
4515 : 43
5185 : 17
54 270 : 27

**3.** Выканай дзяленне з астачай.

7107 : 34 10 046 : 93 77 747 : 86

**4.** Знайдзі значэнні выразаў.

1 000 000 – 12 524 · 27 5437 + 520 · 60

**5.** Знайдзі значэнні выразу $a + 1155 : a$, калі $a$ роўна 3; 5; 7; 11; 33.



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 118

**6.** Поле мае форму прамавугольніка з даўжынямі старон 70 м і 50 м. Мінеральныя ўгнаенні ўносяць з разліку 100 г на квадратны метр. Колькі кілаграмаў угнаенняў трэба для гэтага поля?

**7.** Група турыстаў за 4 дні праехала 1866 км. У першы дзень яна праехала шостую частку ўсяго шляху. Якую адлегласць засталося праехаць турыстам?

**8.** Для таго каб прыгатаваць кашу, на 2 шклянкі малака трэба ўзяць 7 сталовых лыжак круп. Колькі лыжак круп спатрэбіцца, каб прыгатаваць кашу з шасці шклянак малака?

**9.** Алесь збіраў у лесе грыбы. Кожныя 20 метраў ён знаходзіў грыб. Колькі метраў прайшоў Алесь ад першага грыба да апошняга, калі ўсяго знайшоў 25 грыбоў?

Алесь кажа:

Усяго я прайшоў палову кіламетра.



Ці праўду кажа Алесь?

? Пры дзяленні з астачай ліку 6 на лік 25 Юля атрымала ў адказе 6 (аст. 25). Ці правільна Юля выканала дзяленне з астачай?

**1.** Вылічы.

11 707 : 23 17 516 : 29 20 085 : 65

**2.** У майстэрні было 960 м тканіны. На ўсе сукенкі пайшла восьмая частка гэтай тканіны, па 4 м на кожную сукенку. Колькі сукенак пашылі?



Правообладатель Национальный институт образования